УДК [811.161.3(092)+929Жыдовіч](082)
ББК 81.2Беи я43
Б 43

Рэдакцыйная калегія:
*М. Р. Прыгодзіч, М. І. Свістунова* (адк. рэдактары),
*І. А. Гапоненка, Г. І. Кулеш, І. А. Каралёва, Э. А. Ялоўская.*

Рэцэнзенты:
член-карэспандэнт НАН Беларусі,
доктар філалагічных навук, прафесар *А. М. Булыка*;
доктар філалагічных навук, прафесар *В. В. Шур*.

Б 43 **Беларускае** слова на скрыжалях гісторыі: матэрыялы навук. чытанняў, прысвеч. 100-годдзю з дня нараджэння праф. М.А. Жыдовіч, (19 кастр. 2006 г., г. Мінск) / Бел. дзярж. ун-т; адк. рэд. М. Р. Прыгодзіч, М. І. Свістунова. – Мінск, 2007. – 120 с.

У кнізе змешчаны матэрыялы навуковых чытанняў, праведзеных кафедрай гісторыі беларускай мовы на філалагічным факультэце БДУ. Падаюцца ўспаміны калег і вучняў пра першую ў Беларусі жанчыну-доктара філалагічных навук. Таксама змешчаны навуковыя распрацоўкі, што працягваюць гістарычнае даследаванне беларускай мовы, якое паспяхова праводзілася Марыяй Андрэеўнай Жыдовіч.

Адрасуецца навукоўцам, настаўнікам, студэнтам.

**УДК [811/161/3(092)+929Жыдовіч](082)**
**ББК 81.2Беи я43**

© Белдзяржуніверсітэт, 2007



*Дзяды – у коласе і ў слове –*
*Дыханнем грэюць нашы дні.*
*Пачуй у спеўнай роднай мове*
*Былога токі-карані.*
*М. Мятліцкі*

## ЯНА БЫЛА ПЕРШАЙ

Нарадзілася Марыя Андрэеўна Жыдовіч 19 кастрычніка 1906 г. у вёсцы Дукора Пухавіцкага раёна. У біяграфіі гэтай жанчыны-працаўніцы найчасцей сустракаецца слова *ўпершыню*. Яна была першай з чатырох дзяцей у сям'і, хто здолеў атрымаць вышэйшую адукацыю. Ужо ў 1930 г. пасля заканчэння Магілёўскага педагагічнага тэхнікума яна пачала педагагічную дзейнасць у Бярозаўскай СШ Хоцімскага раёна. Вучні і іх бацькі любілі і паважалі настаўніцу, але ёй не давала спакою жаданне вучыцца далей: у 1934 г. яна (ужо была замужам і мела двухгадовую дачку Іну) паступіла на філалагічны факультэт Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута. Гады вучобы прадвызначылі навуковы інтарэс будучай даследчыцы – гісторыя беларускай мовы. Марыя Жыдовіч выдатна закончыла інстытут і была рэкамендавана ў аспірантуру. За няпоўныя тры гады яна падрыхтавала дысертацыю па мове Супрасльскага летапісу і ў чэрвені перадала рукапіс навуковаму кіраўніку. Але пачалася вайна. Лёс закінуў М. Жыдовіч у Мардовію, дзе яна і закончыла аспірантуру Уральскага універсітэта. Дысертацыю давялося пісаць нанова, бо рукапіс і картатэка загінулі ў Мінску. Як толькі ў 1943 г. на станцыі Сходня пад Масквой запрацаваў Беларускі дзяржаўны універсітэт, Марыю Андрэеўну адклікалі ў распараджэнне рэктарата і прызначылі выкладчыкам беларускай мовы. З таго часу з БДУ была звязана ўся яе дзейнасць. У жніўні 1944 г. М. Жыдовіч абараніла кандыдацкую дысертацыю, з 1949 г. працавала дацэнтам кафедры беларускай мовы, чатыры гады (1951–1953) была дэканам філалагічнага факультэта, значны час па сумяшчальніцтве працавала ў Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР.

Самы дасведчаны гісторык беларускага мовазнаўства Іван Германовіч выявіў усяго 19 навуковых публікацый Марыі Жыдовіч, першая з якіх («Мова Супрасльскага летапісу») хоць і была прачытана на сесіі Акадэміі навук у канцы 1945 г., аднак апублікавана толькі ў 1948 г. У творчай спадчыне даследчыцы мы не знойдзем

ніводнай (!) так званай прахадной працы. Літаральна кожны артыкул уносіў у лінгвістыку першаадкрыццё. Наватарскім стаў і навучальны дапаможнік для студэнтаў ВНУ «Нарысы па гісторыі беларускай мовы» (1957). У краіне яшчэ гаспадарылі памагатыя рэпрэсіўнага рэжыму, яшчэ трывожна было за лёс кожнага навукоўца, але Афанасій Бірала, Міхаіл Булахаў, Марыя Жыдовіч, Аркадзь Жураўскі, Марыя Карнеева-Петрулан, Варвара Крыўчык, Барыс Лапаў і Юзэфа Мацкевіч, фактычна першымі сярод усходніх славян, за выключна кароткі тэрмін стварылі працу, многія палажэнні якой прадвызначылі лёс і ход далейшых даследаванняў мовы беларускага народа. Пяру маладой даследчыцы належаць раздзелы «Уводзіны», «Фанетыка» (акрамя параграфа «Аканне») і «Назоўнік». У 1957 г. выйшаў з друку і падручнік «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Марфалогія», дзе раздзелы «Часціны мовы» і «Назоўнік» распрацавала М. Жыдовіч. Літаральна праз год яна паспяхова абараніла доктарскую дысертацыю «Іменнае скланенне ў беларускай мове: Назоўнік. Ч. 1. Адзіночны лік» (1958) і стала першай у Беларусі жанчынай – доктарам філалагічных навук па мовазнаўстве. У гэтыя гады яна працавала разам з Яўгеніяй Рамановіч і Аленай Юрэвіч над «Бібліяграфічным указальнікам літаратуры па беларускаму мовазнаўству» (1960), куды ўвайшлі працы ад самых ранніх – з 1825 г. да апублікаваных у 1958 г. Новы бібліяграфічны даведнік «Беларускае мовазнаўства» (1967; у яго стварэнні прыняла ўдзел Алена Васілеўская) стаў пачаткам адпаведнай серыі кніг, апошняя з якіх выйшла ў 2004 г. і ахоплівае публікацыі 1986–1991 гг. Варта адзначыць, што ўказаныя ў гэтых даведніках часавыя межы не зусім дакладныя, паколькі тут прыводзяцца звесткі і аб некаторых працах па беларускай мове, створаных яшчэ да 1825 года. Так, напрыклад, падаецца вядомы артыкул К. Калайдовіча «О белорусском наречии», апублікаваны ў Працах таварыства аматараў расійскай славеснасці пры імператарскім Маскоўскім універсітэце ў 1822 годзе. З другога боку, у даведнікі не трапілі дзве важныя публікацыі Самуіла Ліндэ – «O statucie litewskim, ruskim językiem i drukiem wydanym, wiadomość», «O literaturze ruskiej», надрукаваныя ў Варшаве ў 1816 годзе. Дарэчы, рэдактар бібліяграфічнага ўказальніка 1967 года і аўтар уступнага артыкула да яго прафесар Л. Шакун гэтыя працы згадвае. Зрэшты, галоўнае не ў гэтым, бо навуковая грамадскасць Беларусі нарэшце атрымала грунтоўную працу, надзвычай патрэбную ўсім, хто так ці інакш меў справу з беларускай мовай. Гэтыя даведнікі з поўным правам можна лічыць зыходнай асновай фарміравання новай лінгвістычнай галіны – гісторыі беларускага мовазнаўства.



*М. А. Жыдовіч (1960-я гг.)*





*Пачатак 50-х гг.: пасяджэнне кафедры беларускай мовы і літаратуры БДУ (загадчык – дацэнт М. Р. Ларчанка). Другая справа – кандыдат філалагічных навук дацэнт М. А. Жыдовіч*

Неаспрэчныя заслугі М. Жыдовіч у падрыхтоўцы матэрыялаў для «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы», правядзенні дыялекталагічных экспедыцый са студэнтамі-філолагамі БДУ. Менавіта яна аб'яднала вакол сябе цэлы калектыў выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў на кафедры беларускай мовы, які доўгі час даследаваў дыялектную лексіку цэнтральных раёнаў Беларусі і апублікаваў тры выпускі «Матэрыялаў для слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак» (1970, 1974, 1977). Пазней вучні і калегі Марыі Андрэеўны падрыхтавалі першы том «Слоўніка гаворак цэнтральных раёнаў Беларусі» (1990). На вялікі жаль, рукапіс другога тома гэтай унікальнай працы беззваротна страціўся ў выдавецкай сумяціцы 1990-х гадоў.

Заслужаны дзеяч навукі Беларусі Марыя Жыдовіч шмат зрабіла для падрыхтоўкі навуковых кадраў, яна была кіраўніком і кансультантам 24 дысертацый. Многія яе выхаванцы і сёння з удзячнасцю ўспамінаюць сваю Настаўніцу – строгага і патрабавальнага кіраўніка, спакойнага і добразычлівага выкладчыка і педагога.

19 кастрычніка 2006 года кафедра гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ўрачыста адзначыла 100-годдзе з дня нараджэння М. А. Жыдовіч. Ганаровымі гасцямі і ўдзельнікамі юбілейных чытанняў сталі дачка Марыі Андрэеўны І. А. Каралёва, член-карэспандэнт НАН Беларусі прафесар А. І. Жураўскі, прафесар

Н. В. Гаўрош, дацэнты Э. Д. Блінава, З. А. Зяневіч, Л. І. Сямешка, загадчыкі кафедраў Мазырскага дзяржпедуніверсітэта імя І. П. Шамякіна і Брэсцкага дзяржуніверсітэта імя А. С. Пушкіна дацэнты А. В. Солахаў і М. М. Аляхновіч, выкладчыкі, аспіранты і студэнты філалагічнага факультэта. У выступленнях вучняў, калег і сяброў Марыі Андрэеўны неаднойчы згадваліся працы юбіляра, рабіліся спасылкі на асобныя палажэнні іх, якія па-ранейшаму застаюцца запатрабаванымі беларускай лінгвістыкай.

Падрыхтаваны зборнік прац навуковых чытанняў, прысвечаных 100-гадоваму юбілею М. А. Жыдовіч, – удзячная памяць яе вучняў і калег, напамін пра цудоўнага педагога, аднаго з пачынальнікаў беларускага мовазнаўства.

***Мікалай ПРЫГОДЗІЧ***
*доктар філалагічных навук, прафесар,*
*загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы*
*Беларускага дзяржаўнага універсітэта*



# ВА ЎДЗЯЧНАЙ ПАМЯЦІ ВУЧНЯЎ І КАЛЕГ



***Аркадзь Іосіфавіч Жураўскі*** *–*
*галоўны навуковы супрацоўнік*
*Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,*
*член-карэспандэнт НАН Беларусі,*
*доктар філалагічных навук, прафесар,*
*заслужаны дзеяч навукі,*
*лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі*

## ЁСЦЬ ШТО ЎСПОМНІЦЬ

Перш за ўсё мне хочацца выказаць шчырую падзяку арганізатарам сённяшніх чытанняў за іх прапанову выступіць з успамінамі пра Марыю Андрэеўну Жыдовіч. Стаж майго знаёмства з Марыяй Андрэеўнай бадай самы ранні і вялікі ў параўнанні з іншымі прысутнымі тут калегамі. Я стаў студэнтам філфака БДУ у верасні 1945 г. І быў выпускніком яго 25-га юбілейнага выпуску ў чэрвені 1950 г. З таго часу прайшло ўжо амаль 60 гадоў, і многія дробязныя эпізоды студэнцкага жыцця ўжо забыліся. Але мне добра помніцца выкладчыцкая дзейнасць літаратараў І. В. Гутарава і М. Р. Ларчанкі, моваведаў М. А. Жыдовіч і М. І. Жыркевіча. Марыя Андрэеўна тады была ўжо кандыдатам філалагічных навук і працавала ў тагачасным Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР на пасадзе старшага навуковага супрацоўніка. У Інстытуце ў той час галоўная ўвага нешматлікіх моваведаў была звернута на падрыхтоўку перакладнога руска-беларускага слоўніка і на вывучэнне беларускіх гаворак. Сумесна з Ю. Ф. Мацкевіч і М. В. Бірылам Марыя Андрэеўна ўдзельнічала ў падрыхтоўцы «Праграмы па вывучэнню беларускіх гаворак і збіранню звестак для складання Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы», якая была выдадзена пад рэдакцыяй М. А. Жыдовіч у 1950 г. Па гэтай праграме на працягу многіх наступных гадоў праводзіўся адбор дыялектнага матэрыялу шляхам экспедыцый у розныя мясціны Беларусі, у экспедыцыях удзельнічала і сама Марыя Андрэеўна. Адначасова яна па сумяшчальніцтву працавала выкладчыцай на філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта.